ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ '90

ЧАЦВЕР 31 МАЯ № 18(1647)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ВОСЬ ДЫК ДЗІВА!

Крама ў храме

Вы ўваходзіце ва універсітэцкі двор ці корпус, а там — крама з разнастайнымі тавараміе. Ну і, зразумела, таўкатня, лаянка... Наўрад ці хочацца каму ўбачыць такое ў храме навукі. Але рэчы першай неабходнасці, якія ўсё часцей не знайсці ў магазінах, патрэбны ўсім.

У Гомельскім універсітэце знайшлі свой спосаб барацьбы з дэфіцытам — тут распаўсюджваюцца талоны на тавары, якія прадае спецыяльна для універсітэта ў яго новым корпусе фізічнага факультэта і на гаспадарчым двары універмаг «Гомель». Райвыканком зацвердзіў нормы продажу тавараў для студэнтаў: на 100 чалавек пэўная колькасць абутку, касет, рушнікоў, кашуль...

А што ў нас? Прафком студэнтаў звяртаўся ва універмаг «Беларусь» з просьбай распачаць ва універсітэце гандаль прамысловымі таварамі, дакладней, іх размеркаванне. Адказу ад магазіна пакуль няма.

Тым часам гарвыканком прапанаваў БДУ, як і іншым ВНУ і прадпрыемствам, беспрацэнтную пазыку на атрыманне ў 1993 годзе некаторых тавараў.

Універсітэту выдзелены: 1 швейная машына, 4 відэамагнітафоны, 13 каляровых тэлевізараў і бытавы персанальны камп'ютэр. Усё, акрамя камп'ютэра і трох тэлевізараў, ужо размеркавана. Той, хто набыў аблігацыю дзяржаўнай пазыкі на адзін з гэтых тавараў, гарантуе сабе яго набыццё праз тры гады. Няма гарантыі толькі, што кошт застанецца ранейшым. Магчыма, менавіта гэта бянтэжыць тых студэнтаў, якім патрэбны тэлевізар, але не хапае рашучасці на незвычайную форму яго куплі.

І сапраўды, смельчаком трэба быць і ўпэўненым у заўтрашнім дні чалавекам, каб прадугледзець, што там будзем ў тым далёкім 1993-м...

«БЮРАКРАТЫЧНЫ» ВЕСНІК

Дзе жывуць навіны?

Зразумела, сярод нас з вамі. Але часам нешта новенькае праходзіць міма, а нешта не здольна засяродзіць нашу ўвагу. Таму заўсёды нядрэнна скарыстаць тую-сюю скарбонку цікавых фактаў. Аказваецца, у гэтай ролі могуць выступаць не толькі сродкі масавай інфармацыі. Свежыя навіны можна знайсці, напрыклад... ва універсітэцкай канцылярыі. Там, у стосах загадаў умяшчаецца значная частка універсітэцкага жыцця. Вось такое незвычайнае і адначасова звычайнае адкрыццё: пакой з бюракратычнымі функцыямі, у якім мы ставім пячаткі і подпісы на розныя дакументы,— яшчэ і сховішча цікавага. Зазірнем? Навіны тут захоўваюцца самыя разнастайныя.

На аддзяленні сацыялогіі зацверджаны спецыялізаваны савет па абароне дысертацый на саіскканне вучонай ступені доктара сацыялагічных навук — згодна з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі пры Савеце Міністраў СССР. Застаецца спадзявацца, што следам за нараджэннем у БДУ новага аддзялення з'явіцца і вучоныя сапраўды новага тыпу.

Вам давялося слухаць лекцыі дацэнта В. І. Громака з кафедры дыферэнцыйных ураўненняў і старшага навуковага супрацоўніка Сацыялагічнага навукова-даследчага цэнтра А. Ц. Манаева? Тады можаце лічыць гэта асабістай удачай. А калі часта прапускалі лекцыі — пашкадуйце. Зараз гэтыя выкладчыкі дзеляцца сваімі ведамі ў іншых краінах.

А нашы замежныя студэнты тым часам спрабуюць сваімі метадамі змагацца з існуючай для іх сістэмай выязду ў іншыя гарады Савецкага Саюза — некаторыя з іх робяць гэта без неабходнай візы. І часам атрымліваюць пакаранне. Як студэнт падрыхтоўчага аддзялення Худжэйры Халеду з Лівана — ён атрымаў строгую вымову.

Каб ехаць у горад Сакі Крымскай вобласці, візы не патрэбны... для зборнай каманды універсітэта па шахматах. Яна будзе ўдзельнічаць у Другім міжнародным шахматным фестывалі, што пройдзе з 1 да 10 чэрвеня ў крымскім горадзе.

І яшчэ пра шмат навін можна прачытаць ў канцылярыі. Але наўрад ці кожнаму жадаючаму дазволяць даведацца аб іх такім чынам. У адказ на падобную просьбу, магчыма, параяць больш уважліва глядзець навокал — каб потым не шукаць цікавае на паперы.

ПА САКРЭТУ УНІВЕРСІТЭТУ

Знаёмцеся: новы прарэктар

Сёння ў нас сустрэча са старым знаёмым. Пётр Дзмітрыевіч КУХАРЧЫК стаў ПРАРЭКТАРАМ.

— Віншуем Вас з пасадай першага прарэктара!

— Дзякуй! Толькі не першага — я прарэктар па вучэбнай рабоце, роўны сярод астатніх.

— Пётр Дзмітрыевіч, пазнаёміўшыся с Вашай біяграфіяй, можна зрабіць вывад, што Вы — уладальнік вельмі лагічнай, паслядоўнай кар'еры ў навуцы. Ад студэнта БДУ, малодшага навуковага супрацоўніка, потым старшага навуковага супрацоўніка да выконваючага абавязкі загадчыка лабараторыі НДІ прыкладных фізічных праблем і загадчыка гэтай лабараторыі. І, нарэшце,— доктар навук, загадчык кафедры.

Ці лічыце пасаду прарэктара вяршыняй у гэтым ланцужку?

— Безумоўна. Гэта ў роўнай, значнай, ступені нечаканае і прыемнае прызначэнне для мяне.

— Чым Вы займаліся ў першы дзень на новым месцы?

— Удзельнічаў у пасяджэнні вучонага савета універсітэта і... ездзіў на сваю кафедру.

— Значыць, развітвацца з ёй не збіраецеся?

— Не. Буду па-ранейшаму ўзначальваць яе, толькі цяпер на грамадскіх пачатках.

— Ці супадае кола Вашых прарэктарскіх абавязкаў з тым, што Вы лічыце неабходным зрабіць для універсітэта ў першую чаргу?

— У асноўным супадае. Я буду займацца справамі і праблемамі прыродазнаўчых факультэтаў — гэта мне блізка.

Галоўным для універсітэта лічу развіццё яго матэрыяльна-тэхнічнай базы. Больш за ўсё заклапочвае мяне стан нашых карпусоў і ўзровень абсталявання.

Цяганіна з будаўніцтвам новага універсітэцкага гарадка яшчэ больш ускладняе гэтыя праблемы, асабліва тым, што ўсе мы раз'яднаныя, і вельмі многа губляем з-за гэтага.

Я часта ўспамінаю, якім быў універсітэт гадоў 20 назад. Тады былі іншыя, больш шчырыя, адносіны паміж людзьмі і больш якасныя паміж падраздзяленнямі. Ды і матэрыяльная база універсітэта адпавядала таму часу.

Хочацца зноў убачыць універсітэт адзіным сучасным навуковым комплексам.

— Каму Вы збіраецеся аддаваць больш увагі як прарэктар — студэнтам ці выкладчыкам?

— Маё крэда — выкладчыкі без студэнтаў не патрэбны.

АДРАДЖЭННЕ

Скарына ў вочы нам глядзеў

Свята славянскага пісьменства і культуры.

Яно не абмінула універсітэт, пачалося тут з першага дня — 24 мая. Нашымі гасцямі былі вядомыя расійскія пісьменнікі: Валянцін Распуцін, Васіль Бялоў, Уладзімір Крупін, паэтэса Таццяна Смерціна. Разам з імі беларускія Васіль Зуёнак і Іван Чыгрынаў.

Яны прыехалі прама са святочнага шэсця, поўныя ўражанняў, усхваляваныя. Але паўнацэннага працягу свята ва універсітэце не атрымалася. Паўпустая зала не жадала размаўляць са знаўцамі чалавечай псіхалогіі і жыцця аб прызначэнні свята. Адно займала яе — палітыка. І Валянцін Распуцін цікавіў толькі як народны дэпутат СССР. Ён адказаў на пытанні: Як Вы апынуліся ў Прэзідэнцкім Савеце? Пазіцыя якіх дэпутатаў Вам ім пануе? Якой бачыце будучыню Саюза ССР?

Але не абышоў увагай і пытанні, якіх не было:

— У нас, славян, асаблівая роля ў свеце. Ідэалы, вызначаныя нам самой прыродай, — не матэрыяльныя, а духоўныя. Жыць у гэтым свеце паасобку нам нельга.

Васілю Бялову таксама не давялося пазбегнуць палітычных пытанняў. Але ён хутка параіў:

— Я б на вашым месцы адключыўся ад палітыкі і паслухаў вершы — тут ёсць добрыя паэты.

Але так і засталася сустрэча ў славянскім універсітэце са славянскімі пісьменнікамі далёка ад усяго славянскага...

Хоць былі жывым папрокам яе напрамку некалькі чалавек на адным з першых...

Яны мала размаўлялі па-беларуску, бо лягчэй для іх карыстацца англійскай ці нямецкай мовай. Але прыехалі на свята дзякуючы менавіта беларускай мове і літаратуры.

Што адчуем мы, успомніўшы, што жывём на беларускай зямлі, калі даведаемся, што Томас Берд захапіўся нашай мовай, убачыўшы аднойчы ў дзяцінстве беларускую кніжку? І дагэтуль ён, прафесар Нью-Йоркскага універсітэта, не развітваецца з беларускай мовай. Дарэчы, у Нью-Йорку існуе і дзейнічае Беларускі інстытут навукі і мастацтва.

Што будзем мы казаць пра нашы ўступныя экзамены па беларускай мове і літаратуры, пазнаёміўшыся з Пітэрам Майо з Вялікабрытаніі? Ён узначальвае кафедру рускай і славянскіх моў у Шэфілдскім універсітэце, а яшчэ вядзе курсы беларускай мовы і літаратуры.

У родным горадзе Моцарта таксама вывучаюць беларускую мову. Гэта засведчылі Герман Бідэр і Фердзінанд Нойрайтэр з Зальцбурга.

З аматарамі беларускай мовы з заходніх краін сустрэўся 28 мая рэктар Ф. М Капуцкі. У размове ўдзельнічалі таксама прадстаўнікі філалагічнага факультэта.

З фрагментамі Свята славянскага пісьменства і культуры вас пазнаёміць другая старонка. Фота А. ГУСАКА.

Дзяжурная служба «Беларускага універсітэта» Вераніка БЯГУН і Сяргей ГРЫЦ (фота).

НАША ЎЗЯЛО!

Габраўцы б год усміхаліся

На працягу ўсяго навучальнага года мы віншавалі сябе, вас, паважаныя чытачы, і саміх «віноўнікаў» — універсітэцкую каманду КВЗ. Гэта не было авансам. І ўсё ж, мы разам рыхтаваліся да галоўнай перамогі сваіх вясёлых і знаходлівых. ЯНЫ ВЫЙГРАЛІ ФІНАЛ!

26 мая разам з імі выступалі і перамаглі студэнты Мінскага медыцынскага інстытута. Праціўнікам-няўдачнікам засталася каманда віцебскіх ВНУ.

Узнагародай, акрамя шматлікіх шчырых віншаванняў, будзе паездка ў Балгарыю надыходзячым летам. Магчыма, пераможцы наведаюць і славуты горад Габрава? І зарадзяцца там класічным гумарам — на рахунак новых перамог!

НУ І НУ!

Кося,«катеося», і «консексус»

У Беларускім універсітэце вядома даўно:нічога не можа быць лепш апошнімі днямі мая,чым славянскі вечар на філалагічным факультэце. У гэтым годзе ён называўся «Вялікі славянскі «консексус».

Наўрад ці знойдзецца студэнт-ветэран, які здолее адказаць, з якога часу пачала кафедра тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства (жартоўная назва на рускай мове «КАТЕОСЯ») праводзіць славянскія вечары. Але любы філфакавец пацвердзіць: колькі ён сябе памятае на факультэце, столькі ж ён памятае і КОСЮ (КАТЕОСЯ да вясны мінулага года называлася кафедрай агульнага славянскага мовазнаўства — КОСЯ).

Лінгвісты — самы жывы народ на філфаку: ні ад ніводнай кафедры не дачакаешся столькі смеху, як ад КАТЕОСІ. Супрацоўнікі менавіта гэтай кафедры — дактары і кандыдаты навук — пабеглі ў спартыўную залу разам са студэнтамі ганяць баскетбольны мяч. І, зразумела, выйгралі. З чым, між іншым, і павіншавалі самі сябе на славянскім гульбішчы.

І за язык КАТЕОСЮ не патрэбна цягнуць: неверагодна гаваркі народ сабраўся! Такія славянскія вечары кожны год пакажуць, што размоў — на год. Памятае, бясспрэчна памятае факультэт і містэра філфака Жэню Махоціна (1985 г.), і прыма-вейру Мілу Мельнікаву (1986 г.). Вось і дзевяносты год пакінуў у філфакаўскай памяці геркулесаўскае аблічча містэра-«консексуса» — Глеба Палякова, які заваяваў у конкурсе «охмурёжа» руку і сэрца і ўсё астатняе «ранняй і свежай» (па трапнаму выразу аднаго з прафесараў) вядучай «Консексуса-90» Светы Сінельнік.

Старажылы філфака да гэтага часу з цеплынёй у вачах успамінаюць, як на праслаўленай сцэне па вуліцы Чырвонаармейскай, 6, узяўшыся за рукі, танцавалі канкан тры кандыдаты і адзін доктар філалагічных навук. У майскі вечар 1990 года адзін з іх, Якаў Леанідавіч, актыўна танцаваў канкан ужо за сцэнай, у якасці рэжысёра славянскага банкету: каб своечасова вынеслі ватны манекен прафесара, двойчы доктара, кіраўніка КАТЕОСІ, каб гледачы, седзячы на крэслах, падаконніках і на падлозе, штурхаючыся ў дзвярах, убачылі і пачулі польскія, балгарскія, чэшскія песні, беларускія канты, трапныя жарты Я. Трамбавольскага, «Малінавы звон» студэнта з Карэі Кім Чар Сена, сурдасінхроннага Урмаса Йота ў імправізацыі Аляксандра Караблікофа, выкрутасы на «брава» дамарослага М. Джэксана, сардэчны голас Светы Кончык, прафесійны калектыў «Суполка», Алу Барысаўну П., тав. Недарэзава з АН БССР, бенефіс на «біс» першага курса, прамы тэлерэпартаж з сёмага інтэрната універкінастудыі «ЗФ».

Зоркі не злічыць!...

Яшчэ адзін славянскі «Консексус» адбыўся. Прызавыя «Сланы» (аналагічна «Арфеям» і «Оскарам») раздадзены. Яшчэ адзін год пражыты. Не бяда: супляменнікам Кірылы і Мефодзія чакаць засталося нядоўга: у маі 1991 года КАТЕОСЯ зноў пакліча славян, як казаў філфакаўскі выхадзец паэт Марк Мерман, у «самы лепшы дом на ўсёй Чырвонаармейскай».

ФІЛФАКАВЕЦ СА СТАЖАМ.

З КНІГІ ГІНЕСА

*РЭКОРД па працягласці камандной гульні ў настольны футбол утрымлівае чацвёрка аматараў гэтага віду забавы з ФРГ — Фолькер Брайтэнрайхер, Петэр Мюллер, Хольгер Нікель і Йорг Шнекенбах. У горадзе Мангейме яны прывялі за гульнёй, што праходзіла з 15 да 19 мая 1986 года, роўна 80 гадзін.

*АДСТАЎНЫ палкоўнік Ваенна-Паветраных Сіл ЗША Джон Кіцінжар — першы чалавек, які рызыкнуў перасячы ў адзіночку Атлантычны акіян на паветраным шары. 14 верасня 1984 года ён прыняў старт у Карыбу (штат Мэн, ЗША) на аэрастаце «Розі О-Грэйдзі», абалонка якога была напоўнена 3000 м³ гелію, і пераадолеў, знаходзячыся ў паветры, каля 5701 кіламетра. Паветраны падарожнік быў у дарозе 86 гадзін, перш чым змог прызямліцца ў раёне італьянскага горада Мантэнотэ.

АДРАДЖЭННЕ

СКАРЫНА Ў ВОЧЫ НАМ ГЛЯДЗЕЎ

ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТОК

Канферэнцыя МЖК

У красавіку адбылася III справаздачна-выбарная канферэнцыя гарадской арганізацыі маладзёжных жыллёвых комплексаў. Яна насіла рабочы характар, была пазбаўлена параднага дэкору і «вясельных генералаў» у прэзідыуме і ў зале. Гэта, бясспрэчна, добра. Аднак абстаноўка, пазбаўленая залішняй святочнасці і строгай афіцыяльнасці, крыху расхаладзіла асобных дэлегатаў, не дазволіла ім асэнсаваць важнасць падзеі. Адсюль — хаджэнне па зале ў час выступленняў, сумбур пры галасаванні... Ды і пачыналася канферэнцыя з сумнага чакання кворуму.

Канкрэтнымі, пазбаўленымі шматслоўя і недакладных фармулёвак, імкнення пабудаваць перад дэлегатамі «пацёмкінскія вёскі», былі справаздачныя даклады старшыні гарадскога Штаба В. Старых і старшыні Рэвізійнай камісіі Н. Кісялёвай. Ім, праўда, можна было б пажадаць большай шырыні перспектывы, праблемнай глыбіні і вастрыні.

Патрабавальнасць, дакладнасць паведамленняў, магчыма, садзейнічалі таму, што ні ў кога з прысутных не ўзнікла жадання выступіць у спрэчках, таму дэлегаты адразу перайшлі да наступнага пункту парадку дня — абмеркавання і прыняцця паправак да Статута гарадской арганізацыі МЖК. Найбольшыя дэбаты разгарэліся вакол пытанняў аб статутным замацаванні абавязку штаба перыядычна трымаць справаздачу перад Саветам па ўсіх напрамках сваёй дзейнасці, а таксама з нагоды неабходнасці і памераў уступных і членскіх узносаў. Пасля доўгай дыскусіі быў зацверджаны мінімальны (з прапаноўваемых) памер членскага (1 руб.) і ўступнага (1 руб.) узносаў.

Канферэнцыя прыняла рашэнне сфарміраваць на працягу месяца новы састаў Савета на прынцыпах роўнага прадстаўніцтва рэгіянальных МЖК. На гэтых жа прынцыпах стваралася і Рэвізійная камісія.

Найбольш зацікаўлена і ажыўлена праходзілі выбары старшыні гарадскога Штаба, які, у сваю чаргу, у адпаведнасці са Статутам, на працягу месяца фарміруе новы Штаб і прадстаўляе яго на зацвярджэнне гарадскому Савету. Выбары былі альтэрнатыўнымі — на пасаду старшыні прэтэндавалі Барысевіч (ВА «Крыніца»), Ю. Пазняк (БДУ) і С. Мазурэнка (АН БССР). Першы кандыдат адразу ж узяў самаадвод, прапанаваўшы сваім патэнцыяльным прыхільнікам галасаваць за С. Мазурэнка, чыя перадвыбарная праграма здалася яму найбольш пераканаўчай.

Як заўсёды, з запалам і не без вострых, радыкальных фармулёвак выкладаў сваё бачанне сённяшняга і заўтрашняга дня МЖК Ю. Пазняк. У цэнтры яго праграмы — барацьба з небяспекай бюракратызацыі руху, прадастаўленне большай свабоды рэгіянальным комплексам і іх аргкамітэтам, стварэнне рэспубліканскай асацыяцыі МЖК. Некалькі недастаткова абгрунтаванай і аргументаванай здалася прысутным заява кандыдата аб магчымасці стварэння партыі на базе руху МЖК.

Праграма Сяргея Мазурэнка вызначалася аналітызмам, сістэмнай дакладнасцю і... асцярожнасцю. Як і на выбарах у гарадскі Савет народных дэпутатаў, у аснову яго погляду былі пакладзены здаровы сэнс і цвярозы разлік. Гэта граматная, умерана-цэнтрысцкая праграма, на жаль, недастаткова канкрэтная і яркая (што адзначалася асобнымі дэлегатамі).

У выніку галасавання большасцю галасоў старшынёй гарадскога Штаба быў выбраны Юрый Віктаравіч Пазняк (кандыдат фізіка-матэматычных навук, выкладчык БДУ, старшыня аргкамітэта МЖК БДУ).

В. КАРАТАЙ, выкладчык філалагічнага факультэта, член Штаба МЖК г. Мінска.

«ГАЙД»-ПАРК

Мерка — для ўсіх адна,

АБО ПРА ТОЕ, АБ ЧЫМ СКАЗАЎ І ШТО НЕ ПАСПЕЎ СКАЗАЦЬ НА ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ

У абноўленай партыі на ўсіх узроўнях яе структурнай арганізацыі павінны быць толькі два аддзелы — арганізацыйны і ідэалагічны. Гэта прывяло б да таго, што партыя занялася б непасрэдна сваімі справамі, а таксама садзейнічала скарачэнню партапарата, колькасць якога на сённяшні дзень, калі верыць кіраўніку спраў ЦК КПСС Н. Е. Кручыню, складае (без уліку колькасці тэхнічных супрацоўнікаў) 179450 чалавек.

Але ў гэтай лічбе можна засумнявацца, таму што, калі гэта сапраўды так, то, напрыклад, у ЦК КПБ задзейнічана ўсяго 79 адказных работнікаў, а ў гаркоме — 20. Узнікае пытанне: ці не надта многа плошчы даводзіцца на аднаго адказнага работніка? І наогул, ці можа цывілізаванае грамадства ствараць такія ўмовы сваім функцыянерам, калі сотні тысяч людзей маюць патрэбу ў адсяленні з забруджаных раёнаў, а ў цэлым па краіне дзесяткі мільёнаў стаяць у чарзе на атрыманне кватэр? Ці не з'яўляецца адной з прычын нашай сацыяльнай беднасці ўтрыманне велізарнага партыйнага апарату, які дубліруе функцыі савецкіх, гаспадарчых і іншых органаў?

Дзякуючы скарачэнню колькасці партыйных функцыянераў з'явіцца магчымасць пераводу апаратаў абкома і гаркома ў будынак ЦК КПБ, а вызваленае памяшканне перадаць, скажам, матэматычным факультэтам універсітэта.

Матэматыка — фундамент прыродазнаўчых, тэхнічных і — усё ў большай ступені — гуманітарных навук. Па ўзроўню развіцця матэматыкі ў краіне можна меркаваць аб яе патэнцыяльнай эканамічнай магутнасці. Аднак ці можна забяспечыць нармальны вучэбны працэс без адпаведных плошчаў? Нормай з'яўляецца 1,8 м² на аднаго студэнта. Ва універсітэце яна складае прыкладна адзін метр, а на механіка-матэматычным факультэце і таго менш.

Увесь цывілізаваны свет ужо даўно ўсвядоміў, што найбольш эфектыўна ўкладваць сродкі ў інтэлектуальныя віды працы. На жаль, у сярэдзіне 50-х гадоў да ўлады ў нашай краіне прыходзяць пераважна людзі некампетэнтныя. Па іх віне амаль у шэсць разоў змяншаецца колькасць расходаў у разліку на аднаго студэнта ў адносінах да нацыянальнага даходу на душу насельніцтва.

І яшчэ адна прапанова. Існуючыя формы спецыяльнай партыйнай адукацыі даўно зжылі сябе. Партыйныя школы выконваюць функцыі кузні наменклатуры. Яны рыхтуюць выканаўцаў, у той час, як краіне патрэбны людзі думаючыя. Партыйна-палітычную адукацыю чалавек атрымлівае на працягу свайго жыцця, калі, вядома, у яго ёсць схільнасць да грамадскай дзейнасці. Калі чалавек за час вучобы ў ВНУ не засвоіў, у чым сутнасць палітычнай, ідэалагічнай работы, то ніякая спецыяльная партыйная адукацыя яму не дапаможа. Прапаную скасаваць існуючую сістэму партыйнай адукацыі. У сувязі з гэтым вызвалены будынак ВПШ перадаць філасофска-эканамічнаму факультэту універсітэта, які ўзяў бы абавязкі па павышэнню кваліфікацыі партыйных і савецкіх работнікаў, захаваўшы для гэтых мэт некаторыя кафедры ВПШ.

Аб чым яшчэ хацеў сказаць на партыйнай канферэнцыі?

Пасля смерці класікаў марксізму-ленінізму мінулі дзесяткі гадоў. За гэты час жыццё пайшло наперад. Некаторыя грамадазнаўцы не хочуць (ці не могуць) гэтага заўважаць, ператварыўшы марксізм у догму, у той час, як вучэнне Маркса, Энгельса, Леніна (як падкрэслівалі самі аўтары) не догма, а кіраўніцтва да дзеяння.

Як і любая тэорыя, марксізм увасабляе сабой абсалютную і адносную ісціну: абсалютную ў тым сэнсе, што ёсць у марксізме палажэнні, якія будуць заўсёды правільныя; адносную — некаторыя палажэнні вучэння састарэлі, патрабуюць перагляду ў святле таго вопыту, што набыло чалавецтва за апошнія дзесяцігоддзі. Гэта відавочна. Як відавочна і тое, што некаторая частка грамадазнаўцаў аддае перавагу сядзенню на старым багажы, замест таго, каб уважліва ўглядацца ў жывы працэс жыцця, прыслухоўвацца да новых павеваў грамадскай думкі.

Чаму лічу неабходным падняць менавіта гэта пытанне? Таму што, на маю думку, адной з прычын нашага адставання з'явіўся застой у грамадазнаўчых навуках, перш за ўсё ў філасофіі і палітычнай эканоміі.

Гістарычная практыка паказвае, што на пярэднія рубяжы ва ўсіх галінах грамадскага развіцця выходзілі тыя краіны і народы, якія характарызуюцца свабодай навуковай творчасці, дзе не ставіліся перашкоды на шляху фундаментальных даследаванняў.

Філасофія — форма ведаў, якая садзейнічае фарміраванню правільнага, дыялектычнага мыслення. Апошняе не трывае шаблону, схем, ісцін у апошняй інстанцыі. На жаль, наша філасофія па сутнасці такой не з'яўлялася, таму што была дагматызавана. Гэта прынесла сумныя вынікі.

І апошняе пытанне, якое таксама не магу абмінуць. Калі мы патрабуем адмены прывілей для партыйных функцыянераў, то, шчыра кажучы, перш за ўсё варта пазбавіць пэўных прывілей і некаторых работнікаў універсітэта. Меркай значнасці працы чалавека павінна быць яго заработная плата. Ва ўсім астатнім усе работнікі універсітэта павінны быць пастаўлены ў роўныя ўмовы, незалежна ад таго, кім яны працуюць.

І. МАРОЗАЎ, дацэнт кафедры філасофіі.

Канадцы схільныя да перабольшванняў. Калі ёсць басейн, не прамінуць падабраць гучную назву «Водны парк», калі ствараюць дзіцячыя атракцыёны — расстараюцца на сапраўдную «Фантастычную краіну». Хочаш-не хочаш, рэкламная лексіка прымушае гаварыць захоплена. Мы з рэдактарам рэдакцыі Паўночнай Амерыкі АДН Віталем Канжуковым за два тыдні падхапіць вірус агульнага перабольшвання не паспелі. Але грандыёзнасць універсітэцкага гарадка і маланкавасць падзей студэнцкага жыцця не захапіць нас не маглі.

БЕЗ ВІЗЫ

ЯК «АБАНКРОЦІЎСЯ» УНІВЕРСІТЭТ

— Яны трапілі да Фрасэра? — перапытвалі адзін аднаго нашы сябры. Іх здольнасці здзіўляцца шчыра і непасрэдна і кожны раз нібыта ўпершыню можна пазайздросціць.

Мы стрымалі недарэчныя ў той момант усмешкі — нават звычайны ў нашым разуменні прафесар у Канадзе — недасягальная велічыня.

Мюрэй Фрасэр — прэзідэнт універсітэта. І хоць паранейшаму выкладае курс права (каб захаваць кваліфікацыю), не кожны студэнт асмеліцца заскочыць да яго ў кабінет для гутаркі сам-насам. Таму наш візіт да прэзідэнта, безумоўна, ніколькі не нагадвае бесшабашнае барбекю ў доме гасціннай Гейл.

Дзесяць хвілін (потым — нарада ў Фрасэра і экскурсія па універсітэту ў нас) мы абмяркоўваем надзвычай балючую праблему: універсітэт горада Калгары даўно вырас з вузкіх «штонікаў» фінансавання. Не хапае аўдыторый — студэнтам даводзіцца сядзець у праходах залаў на 350 пасадачных месцаў. Скарачаецца колькасць выкладчыкаў — студэнцкія групы на старэйшых курсах адміністрацыя вымушана падвойваць і патройваць.

Субсідзіраванне канадскіх універсітэтаў уяўляе сабой надзвычай складаны і часта заблытаны працэс.

Кожная з дзесяці правінцый кантралюе дзейнасць сваіх універсітэтаў, аднак значная частка сродкаў паступае ва універсітэты ад урада Канады.

592 долары за кожны семестр, што ўносяць за навучанне студэнты-інжынеры, 944 долары студэнтаў-медыкаў і 472 долары астатніх навучэнцаў універсітэта пакрываюць толькі невялікую частку расходаў.

Год назад міністр вышэйшай і сярэдняй адукацыі правінцыі Альберта Дэйв Расэл, задаволены станам спраў ва універсітэце Калгары, заявіў, што студэнты могуць не разлічваць на дадатковае фінансаванне навучання, і прапанаваў замест гэтага праяўляць больш «асабістай ініцыятывы». Магчыма, перапоўненыя аўдыторыі, скарачэнне штатаў і вучэбных курсаў падаліся яму дробязямі, якія не могуць перашкодзіць студэнтам працаваць над сабой.

Але не браць у разлік здольнасць навучэнцаў да здзяйснення спраў больш значных і не настолькі бяспечных міністру не падабае. Калі ў 1986/87 вучэбным годзе было аб'яўлена, што інфляцыя стрымлівае рост планкі субсідый універсітэтам, пяць тысяч студэнтаў правялі імправізаваны марш па шашы Кроўчайлд Трэйл. Некалькі гадзін шэсце блакіравала рух. У той час, калі ўрадавыя чыноўнікі адмаўлялі эфектыўнасць маршу, Саюз студэнтаў здолеў усё ж дабіцца невялікага павелічэння субсідый. Гэта, праўда, не выратавала універсітэт ад «банкроцтва» — прыняцця праграмы кантралюемага развіцця, якая прадугледжвае абмежаванне колькасці студэнтаў дваццаццю трыма тысячамі чалавек. У выніку сотням паступаючых было адмоўлена. Многія з іх падаліся шукаць шчасця на падрыхтоўчых курсах бліжэйшага каледжа. Ці знойдзецца пасля для іх месца ва універсітэце? Такая версія выклікае ўсё больш сур'ёзныя сумненні.

Студэнцкі Саюз застаецца верным сабе ў барацьбе за павелічэнне асігнаванняў на адукацыю і заклікае да яе ўсіх студэнтаў.

— Гэта дастаткова магутная сіла, — згаджаецца прэзідэнт Фрасэр і з выбачлівай усмешкай пакідае крэсла. Час развітвацца.

«МАКДОНАЛЬД», «КРАЙСЛЕР» І ДЗІЦЯЧЫ САД

Нават з вопытным гідам і чалавекам неблагім, студэнтам-палітолагам Чарльзам Кэнэдзі нас не пакідала боязнь... заблудзіцца ва універсітэце. Толькі што мінулі стаянку для аўтамабіляў, а наперадзе — такія ж малалітражныя блізняткі-«таёты», амерыканскія «пантыякі» і «крайслеры». (Зусім не абавязкова, каб апошнія належалі прафесарам — гарадскі трамвай даходзіць да універсітэта паўпустым, бо аўтамабіль дазваляе ў Канадзе эканоміць і час, і 1 долар 25 цэнтаў за кожную паездку ў грамадскім транспарце).

Потым зазірнулі ў адзін сувенірны магазін, праз некалькі крокаў падмаргнула люмінісцэнтнымі агеньчыкамі вітрына чарговага.

Універсітэт Калгары ўражвае фенаменальнасцю наладжвання студэнцкага жыцця ў параўнанні з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі нашай краіны. Студэнты гаспадараць ва ўласным горадзе дзе ёсць усё неабходнае і звыш таго: прадуктовыя і канцылярскія магазіны, мноства крамак з кітайскімі, японскімі, індыйскімі стравамі, кавай, кексамі і, безумоўна, «мак-дональдамі», сталовыя, фотаатэлье, цырульня, дзіцячы садок, міжнародная пошта, бібліятэкі, клубы і спартыўныя залы, жыццё якіх не прыцішваецца ні на адзін дзень, студэнцкі тэатр, інтэрнаты... На бізнес-факультэце нават уласная біржа: на лекцыях — тэорыя, на перапынках — практыка.

Не хапае хіба толькі суровых бабулек на варце кожнага ўваходу і выхаду. І нешта незаўважна, каб нястача гэтая выкладчыкам перашкаджала весці заняткі, а кагосьці са студэнтаў выводзіла з раўнавагі.

— Тое, што вы бачыце, — каменціруе Чарльз, — уяўляе сабой ашаламляльны кантраст з тым, як сціпла пачынаў наш універсітэт у 1960 годзе — два будынкі сярод прэрый тады і трыццаць вучэбных — навукова-даследчых карпусоў цяпер. Універсітэт прапаноўвае курсы для атрымання вучонай ступені ў галіне сацыяльных і прыкладных навук, гуманітарных дысцыплін, мастацтва, фізічнай культуры, інжынернай справы, педагогікі, ландшафтнай архітэктуры, правазнаўства, кіравання, медыцыны, бальнічнай справы і сацыяльнага забеспячэння. У сямі інтэрнатах пражывае 1150 студэнтаў, якія займаюць апартаменты ад аднапакаёвак да чатырохпакаёвых кватэр. Ёсць 250 двухпавярховых домікаў для жанатых студэнтаў.

У холах многа народу — расклад (і гэта даўнішняя традыцыя) складзены такім чынам, што паміж лекцыямі бываюць трохгадзінныя паўзы. Для гутарак з сябрамі ва ўтульных «кафэшках» і студэнцкім клубе, для бібліятэк, для заняткаў спортам — выдатнай спартыўнай базай студэнты абавязаны Алімпіядзе, для перадрукоўкі лекцый на ратапрынтах, якія ёсць у калідорах кожнага корпуса (кошт адной старонкі 5 цэнтаў).

Такім чынам, у інтэрнат нашы канадскія калегі вяртаюцца зацемна, праслухаўшы агульныя лекцыі. Дарэчы, ніякага індывідуальнага разжоўвання матэрыялу ва універсітэце Калгары не практыкуюць і прывычнага для нас вывучэння па прыступках: ад агульнага да прыватнага, таксама. Тут усё ўперамешку: і асноўныя, базавыя дысцыпліны, і спецыялізацыя. Вучыцца ва універсітэце можна і пяць, і дзесяць, і нават трынаццаць гадоў.

«ШУКАЮ РАБОТУ!»

Большасць студэнтаў радуюцца завяршэнню вучобы і ў той жа час з апасеннем глядзяць у перспектыву апынуцца на рынку працоўнай сілы і пачаць асабістую кар'еру. У Канадзе размеркавання спецыялістаў у нашым разуменні няма. Таму пошукі падыходзячага месца з'яўляюцца клопатам выпускніка.

Ужо за паўтара-два гады студэнты пачынаюць «лавіць» вакансіі, прапаноўваць сваю кандыдатуру. Час і сілы, неабходныя для зававання «ідэальнай» работы, залежаць у вялікай ступені ад асабістай ініцыятывы, кваліфікацыі і спецыяльнасці. Часам апошні фактар рашаючы. Рынак працоўнай сілы можа быць надзвычай непастаянным.

У Канадзе дзейнічае некалькі дзяржаўных праграм, якія дапамагаюць выпускнікам знайсці работу па спецыяльнасці. А ва універсітэце нас пазнаёмілі са службамі Цэнтра занятасці. Многія кампаніі і дзяржаўныя агенцтвы рэкламуюць у Цэнтры вакансіі для выпускнікоў. Каб зацікавіць кампаніі ў найме студэнтаў, якія заканчваюць універсітэт па спецыяльнасцях, што не карыстаюцца попытам, правінцыяльныя ўлады, здараецца, прапаноўваюць кампаніям датацыі. Скажам, у выглядзе выплаты дзяржавай часткі зарплаты выпускнікоў, якія паступілі на работу, ці зняцця падаткаў, якія прадпрыемствы абавязаны плаціць дзяржаве.

Многія кампаніі аддаюць перавагу «прамым сувязям». Яны маюць мноства патрабаванняў: ад наяўнасці высокіх адзнак за ўвесь перыяд навучання па вызначанаму спектру прадметаў да якасцей характару. Немалую ролю адыгрывае рэкамендацыя выкладчыкаў. Таму студэнтам даводзіцца падтрымліваць з імі цесныя кантакты.

Камусьці шанцуе, хтосьці вяртаецца ва універсітэт за яшчэ адным дыпломам. Ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі не без гэтага...

МЕСЦА СУСТРЭЧЫ — КАФЕТЭРЫЙ

У Калгары мы прыехалі па запрашэнню незалежнай (і ад адміністрацыі, і ад Студэнцкага саюза) студэнцкай газеты «Гонтліт». Свабода накладвае адбітак на твар газеты і дзеянні рэдакцыі.

Прыкра для Студэнцкага саюза, але «Гонтліт», здараецца, выступае і як палітычная арганізацыя. Студэнцкі саюз, які выбіраецца і ўтрымліваецца на датацыях саміх студэнтаў, адказвае за мерапрыемствы ва універсітэцкім гарадку — такія, як пікнікі, сходы, канцэрты, а таксама аказвае ціск на кіраўнікоў розных узроўняў па тых пытаннях, якія закранаюць студэнцкае жыццё. Традыцыйна «Гонтліт» выступае ў якасці наглядчыка над Студэнцкім саюзам, але, здараецца, ахвяруе журналісцкай аб'ектыўнасцю дзеля палітычных дзеянняў — у тым выпадку, калі члены Саюза адыходзяць ад лініі, якая падтрымліваецца большасцю.

Рэдакцыйныя пакоі (іх пяць, калі ўлічваць фоталабараторыю і залу для адпачынку) — месца сустрэч студэнтаў, выкладчыкаў, «правых» і «левых», пакрыўджаных і абнадзееных. Зала, празваная кафетэрый ці пакой адпачынку, падалося, у жыцці рэдакцыі на першым месцы. Месца правядзення «лятучак» і гутарак журналістаў (амаль усе яны працуюць без ганарараў і ставак і з'яўляюцца студэнтамі) з чытачамі. У закутку — аўтаматычная кававырка. За кожны кубак патрэбна самому ўкінуць у «жасцянку» 25 цэнтаў. Да гэтага прывыклі ды і на сур'ёзную планёрку зусім не абавязкова з'яўляцца «пад гальштукам». Можна мець пры сабе цукеркі, бутэлечкі з кока-колай. Гэта не перашкаджае сарэдактарам Філу Радрыгесу і Валеры Фортні настройваць усіх на дзелавы тэмп. За ўсё пра ўсё — не больш як пятнаццаць хвілін. Пытанняў — незлічоная колькасць, але вырашаюцца яны імгненна і ціха. А потым з'яўляецца надпіс на дошцы. «Для тых, хто адсутнічаў», — растлумачыла мне Крыз Чайніз, бізнес-рэдактар.

Супрацоўнікі «Гонтліта» амаль не карыстаюцца пішучымі машынкамі — ёсць два камп'ютэры і гэтага дастаткова, каб кожны тыдзень з'яўляўся чарговы нумар газеты, якая існуе за кошт рэкламы і датацый студэнтаў у выглядзе шасці долараў у год.

— Не, — пярэчыць Валеры, — яшчэ «начныя змены» фотакора Ціма, разумнае кіраванне рэкламай, якое ажыццяўляе Гейл, няўрымслівасць Роба і жарты Пола, сумесныя паездкі, арганізаваныя Кэнам і выдатныя суботнія барбекю ў доме ўсёй той жа Гейл.

ШМАТКРОП'Е ЗУСІМ НЕ СВЕДЧЫЦЬ ПРА ТОЕ, ШТО Ў АЎТАРА НЕ ХАПІЛА СЛОЎ ДЛЯ ЗАКЛЮЧНАГА АКОРДА. МЫ НЕ СПЯШАЕМСЯ СТАВІЦЬ РАЗВІТАЛЬНУЮ КРОПКУ Ў АБМЕНЕ МАТЭРЫЯЛАМІ СА СТУДЭНЦКАЙ ГАЗЕТАЙ «ГОНТЛІТ» УНІВЕРСІТЭТА КАЛГАРЫ. МАЛА ТАГО, МЫ РАЗЛІЧВАЕМ НА ЯГО ПАШЫРЭННЕ. КАЛІ ШЧЫРА, ВЕЛЬМІ ВУЗКІМІ ПАДАЛІСЯ НАМ ПАСЛЯ ДВУХ ГАДОЎ СУПРАЦОЎНІЦТВА ГАЗЕТНЫЯ СТАРОНКІ. АБМЕНУ ПАТРЭБНА НАБЫЦЬ РЭАЛІІ Ў ЖЫЦЦІ.

З. МАРАВА.
Калгары — Мінск.

СТУДЫЁН

КАБІНКА КАМЕНТАТАРА

Гіравы спорт

Круглагадовая вузаўская Спартакіяда Беларусі ўпэўнена набліжаецца да фінішу. Разам з пачаткам студэнцкіх канікулаў пойдуць у адпачынак і спартсмены. За лета яны набяруцца сіл, каб з пачаткам новага вучэбнага года зноў прыступіць да трэніровак і пачаць спартыўныя адзінаборствы. А яшчэ ў вольны час можна будзе спакойна падумаць і прааналізаваць свае поспехі і няўдачы, зрабіць нейкія вывады на будучае.

Тым, хто захапляецца гіравым спортам, можна пакуль, як кажуць, пажыць спакойна. Першае месца ў круглагадовай вузаўскай Спартакіядзе Беларусі — гэта ўжо аб нечым ды гаворыць. На п'едэстале гонару побач з універсітэцкімі спартсмены БПІ і Інстытута народнай гаспадаркі, якія размясціліся адпаведна на другой і трэцяй прыступках.

Веласпорт-шаша

Спаборнічаючы за прызавыя месцы ў рамках круглагадовай вузаўскай Спартакіяды рэспублікі па гэтаму віду спорту, высокі ўзровень майстэрства, моцную волю, вытрымку і сапраўдны прафесіяналізм паказалі веласіпедысты Інстытута фізічнай культуры. Перамогшы каманды БПІ і БДУ, якія раздзялілі адпаведна другое і трэцяе месцы, яны «прыехалі» на першае.

Шахматы

І зноў — ІФК. Аказваецца, яны не толькі самыя дужыя і хуткія, але і самыя кемлівыя. Дзякуючы гэтай якасці, яны змаглі выйграць Спартакіяду Беларусі сярод вузаўскіх каманд. Дарэчы, з'явіўся ў спаборніцтвах і новы прызёр — каманда Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, якая ўпэўнена заняла трэцяе месца. І, як звычайна, на адным з прызавых месц (на гэты раз на другім) — шахматысты нашага універсітэта.

СТАРТ

КАРАТЭ — для абароны?

Не, каратэ для іх — не капрыз, не проста патрабавальнасць натуры, даніна модзе. Гэта жаданне навучыцца абараняцца. Так, абараняцца. Раней гэтае сцвярджэнне адмовілі б «зверху»: «Мы ж у Савецкім Саюзе, у нас пануе чалавечнасць...»

Але абставіны такое ўменне абумоўліваюць. І «верх» таксама гэта зразумеў, бо ў снежні 1989 года быў дадзены дазвол на стварэнне групы каратэ ва універсітэце. Узначальвае яе Віктар Уладзіміравіч Даўгуненка.

Займаюцца зараз у секцыі студэнты і супрацоўнікі БДУ. Стаць яе членам яшчэ ёсць магчымасць у кожнага жадаючага. З умовай: паважліва ставіцца да людзей і не ўжываць алкаголю і не курыць.

Ці па плячы дзяўчатам мужчынская справа? Сумненні рассеяў кіраўнік групы:

— Ад дзяўчат ніякай звышасаблівай моцы не патрабуецца акрамя хуткіх, амаль аўтаматычных дзеянняў, зладжанасці рухаў і дыхання. Між іншым, у ходзе трэніровак выйрацоўваецца неблагая фігура.

Афіцыйнае прызнанне клуба ўсходняй барацьбы дае права на ўласную базу — у спартыўным комплексе універсітэта: зала, басейн, сауна. І яшчэ, хутка пачнуцца цэнтралізаваныя заняткі на навуковай аснове. Толькі тады можна будзе сказаць аб усебаковым развіцці спартсмена.

Г. ЛАГУН.



Гэтыя здымкі зроблены пад час універсітэцкіх спаборніцтваў па спартыўнаму арыентаванню, удзел у якіх днямі прынялі дзесяткі студэнтаў. Аб тым, як праходзілі спаборніцтвы і аб іх выніках,чытайце ў адным з наступных нумароў нашай газеты.

Фота С. ГРЫЦА.

Вядзе рубрыку Зінаіда АЛЯШКЕВІЧ.

Homo sapiens

Дапамаглі экстрасэнсы

«Баліць у сярэдзіне...» Такія скаргі не аднойчы даводзілася мне чуць у сваёй вёсцы. Але што баліць, і як яно баліць — цяжка было зразумець.

Аднак нядаўна зразумеў, адчуў. Праўда, вам растлумачыць нічога не магу, таму што боль, як колер і гук, як смак і пах, мае шмат адценняў — словамі гэта не перадаць. Калі ў саміх забаліць, тады і зразумееце. Ды што я гавару... Барані божа вас ад такіх пазнанняў, якія набываюцца не розумам, а ўнутранымі органамі.

Што я толькі ні рабіў! Выконваў фізічныя практыкаванні, глядзеў Чумака і Кашпіроўскага... Не дапамагло.

І вось даведваюся, што даюць чарговы сеанс усебаковай тэрапіі экстрасэнсы Талкачоў і Міхайлаў. Дарэчы, самі яны не называюць сябе экстрасэнсамі, пераконваючы, што іх методыка зусім не таго характару. У сапраўдных экстрасэнсаў галоўнае ў сеансе лячэння, а дакладней, адзінае — унушэнне, гіпноз. У Талкачова і Міхайлава курс лячэння складаецца з многіх кампанентаў: фізічная актыўнасць, лячэбнае паветра і загартоўка, зняцце назапашаных электрычных зарадаў і насычэнне станоўчымі эмоцыямі. І толькі апошняе месца ў гэтым доўгім спісе складаемых займае ўнушэнне. І ўсё ж такі яно прысутнічае, таму народных лекараў можна аднесці і да экстрасэнсаў. Як вам хочацца. Але справа, зразумела, не ў тым, як іх назваць. Галоўнае, што іх методыка вельмі надзейная, за дзесяць гадоў ніводнага адмоўнага выніку.

Свае сеансы Уладзімір Андрэевіч Талкачоў і Уладзімір Васільевіч Міхайлаў праводзяць толькі за горадам, на ўлонні прыроды. Хочаце ведаць, чаму? А справа ў тым, што ва ўмовах горада ўсебаковай тэрапіі ніяк не атрымліваецца, выпадае, напрыклад, такі важны фактар, як лячэбнае паветра. Фактычна застаецца толькі адзін кампанент з пералічаных вышэй — фізічная актыўнасць.

Неяк звярнуў увагу, што асабліва карысныя лекавыя расліны і харчовыя прадукты (жэньшэнь, мёд) маюць у сваім саставе вялікі набор розных вітамінаў і мінеральных рэчываў, карацей, яны шматкампанентныя. Магчыма, у гэтай шматкампанентнасці і хаваецца сакрэт усебаковай тэрапіі Талкачова і Міхайлава.

Як праходзяць іх сеансы? Недасведчанаму здаецца, што мы становімся ў круг і пачынаем: «рабі раз — рабі два, глыбокі ўдых і поўны выдых...» Ды такія практыкаванні болей за пятнаццаць хвілін і выконваць не захочацца! А курс лячэння па Талкачову і Міхайлаву працягваецца 24 гадзіны. Як жа дасягнуць, каб кожнаму стала цікава выконваць фізічныя практыкаванні на працягу сутак? З гэтай мэтай усяму курсу лячэння надаецца форма спартыўнага спаборніцтва. Называецца яно — турысцкі марафон.

Удалая назва! Вядома, школьнікі і студэнты не сталі б траціць выхадны дзень на нейкі там курс тэрапіі. А ўдзельнічаць у марафоне — калі ласка!

Прайсці курс лячэння ў Талкачова і Міхайлава карысна і школьніку, і пенсіянеру, і хвораму, і здаровому, таму што недахоп фізічнай актыўнасці адчуваe кожны жыхар горада, нават спартсмены, не гаворачы ўжо пра тых, хто проста займаецца ў групах здароўя. Заўвага аб спартсменах на першы погляд здаецца, мякка кажучы, прадузятай. Але калі параўнаем трэніроўку спартсмена і лячэбны курс, распрацаваны Талкачовым, то параўнанне атрымліваецца не на карысць вялікага спорту. Узяць хоць бы футбол. За час трэніроўкі (ці матча) спартсмен прабягае і праходзіць каля дзесяці кіламетраў. Гэта прыкладна дваццаць тысяч крокаў, дакладней рухаў. А ў Талкачова на фізкультурна-аздараўляльным мерапрыемстве патрэбна прайсці сто кіламетраў, гэта значыць, што нашы суставы зробяць 120 тысяч рухаў. У дзесяць разоў больш!

Для ацэнкі фізічнай актыўнасці, аказваецца, у першую чаргу патрэбна ўлічваць не інтэнсіўнасць рухаў, а іх колькасць. Калі б Талкачоў замяніў хадзьбу спартыўнымі гульнямі, лячэбны эфект адразу ж знізіўся б да мінімуму: пасля двух гадзін інтэнсіўнай нагрузкі патрабуецца працяглы адпачынак, але колькасць рухаў — невялікая.

Па іншых кампанентах лячэбнага курса (лячэбнае паветра, станоўчыя эмоцыі...) спартыўныя гульні таксама не могуць канкурыраваць з турысцкім марафонам.

Мы ўжо неяк прывыклі гаварыць, што спорт дае станоўчыя эмоцыі. Толькі ўдакладніць варта: некаму дае, а ў некага і забірае. Не

ўсе ж могуць стаць пераможцамі, некаму і прайграваць даводзіцца. А на марафоне, калі ты і не ўвайшоў у лік прызёраў, але ўсё ж пераадолеў сто кіламетраў, то як тут не ганарыцца і не радавацца!

Возьмем такі кампанент,як гаючае паветра. У адпаведнасці з лячэбным курсам Талкачова і Міхайлава мы павінны дыхаць паветрам, настоенным на лекавых травах. На палянах у месцах масавага адпачынку, дзе можна арганізаваць спартыўныя гульні, лекавых траў амаль няма. Яны больш цягнуцца да луга і балота, растуць у лясах і на адхілах. Удзельнікі марафону якраз і праходзяць па такіх мясцінах. Яны пастаянна дыхаюць водарам аеру і валер'яны, донніка і дзягіля, зверабою і таволгі...

Яшчэ адно параўнанне. Спартыўныя гульні праводзяцца звычайна на сухой палянцы, а сухая зямля дрэнна праводзіць электрычнасць, не здымае з нашага цела назапашаныя зарады. Тут неабходны кантакт з сырой зямлёй, гэта значыць, лепей выходзіць на вільготныя сцяжынкі.

Вы можаце запярэчыць: не мае значэння, якая там сцяжынка, калі на нагах ізаляваны абутак. Так, вядома, хоць Талкачоў рэкамендуе хадзіць басанож, але не ўсе да гэтага прывучаны. Аднак лячэбна-аздараўляльная дыстанцыя распрацоўваецца заўсёды з такім разлікам, што сапраўды не мае значэння, які ў вас абутак. Яго ізаляцыйныя ўласцівасці знікнуць вельмі хутка, таму што на шляху вашым сустрэнуцца і брод, і балотца, і гаць. Карацей, усё, што запланавана па курсу ўсебаковай тэрапіі, вы атрымаеце спаўна.

Раскажу больш падрабязна, як праходзіў сеанс. Спачатку В. А. Талкачоў даe ўстаноўку:

— Праз нейкі час вы адчуеце боль у нагах вашых, але гэта няхай не засмучае вас, гэта хваробы пачынаюць пакідаць ваша цела. Яны заўсёды выходзяць цераз ногі...

І сеанс пачынаецца. Давялося нашым нагам нямала папрацаваць. Спачатку прайшлі трыццаць кіламетраў, потым яшчэ дваццаць. А ўсяго чатыры этапы.

Хто звяртаецца да Талкачова ўпершыню, ніяк не можа паверыць, што здольны прайсці на працягу сутак сто кіламетраў. Таму Валянцін Андрэевіч настройвае навічкоў толькі на адзін этап. Але прайшоўшы яго, тыя рызыкуюць і на другі, потым на трэці.

Пра свае паўсядзённыя клопаты і ўсялякія хваробы мы забываем, таму што на маршруце раскідана больш дзесятка пікетаў, а іх патрэбна знайсці з дапамогай карты і компаса. Навічкі прыладкоўваюцца да больш вопытных, падвучваючыся на хаду, не прэтэндуючы з першага разу ўвайсці ў лік прызёраў.

Амаль усю дыстанцыю мы ішлі пешшу, і толькі апошні адрэзак шляху — хуткасны. Бачыце, інтэнсіўная нагрузка курсам усебаковай тэрапіі таксама прадугледжана, але яна даецца пад самы занавес, каб ніхто не сышоў з дыстанцыі раней часу.

Сярод мужчын першымі прыйшлі да фінішу Алег Іваноўскі, Валерый Лашук і Андрэй Жалкоўскі.

У жанчын атрымалася такая раскладка: студэнткі БДУ сёстры Вікторыя і Наташа Тукала занялі першае і трэцяе месцы, а між імі ўклінілася Святлана Кошалева з Маладзечна (другое месца).

Асобна падводзіліся вынікі сярод юнакоў. Прызавыя месцы занялі вучні Маладзечанскай СШ № 10 Юра Календа, Юра Лужынскі і Сяргей Галынскі.

Я таксама радуюся ўдаламу фінішу. Усё-такі прайшоў сто кіламетраў. Стаміўся, вядома. Вярнуўся дадому і раней звычайнага лёг спаць. А раніцой прачнуўся і нічога не магу зразумець. Што гэта са мной? Неяк лёгка стала, свабодна, хочацца рухацца, некуды ісці. А галоўнае — нічога не баліць «у сярэдзіне»...

У. ГЕРАСІМАЎ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

31 мая
Зак. 2016.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.